# У Еўропу – так, але з нашай рускай спадчынай

## Размова з
## Пятром Марцавым

Грамадства не прыняло спробаў, распачатых дзеячамі Беларускага Народнага Фронту. І тут ніколі не будзе аднaзначнага вяртання да беларускай культуры: раз, два і маем Вялікае княства Літоўскае. Так, на жаль, не атрымаецца. Узнікне новая свядомасць і новая культура. Нельга адкідваць усяго, што рускае і прымаць толькі тое, што належыць старой беларускай культуры.



**Размаўляючы з беларусамі на тэму нацыянальнай арыентацыі можна пачуць словы пагарды да ўсяго, што рускае, разам з высокай культурай. Ці Вы лічыце такую пазіцыю абгрунтаванай?**

Нянавісць да рускай культуры — гэта рэакцыя на прымусовую двухсотгадовую русіфікацыю. Частка беларусаў лічыць, што гэта культура нясе пагрозу, і што нарабіла толькі шкоды. Цяжка ацаніць, ці сапраўды яна пашкодзіла.

**Ці не выглядае гэтае адмаўленне ад уплыву рускай культуры на Беларусь трохі смешным?**

Так, выглядае. Акрамя таго, не было іншага гістарычнага выбару. Калі б існаваў шанец, каб Беларусь фармавалася пад уплывам іншых культур, можна было б меркаваць, які варыянт быў бы лепшым. Але гэтага не было. Навошта тады раскручваць гэтыя праблемы?

Беларускае грамадства прымае рускую культуру як сваю па адной простай прычыне: мы на ёй выхаваліся. У савецкія часы дамінавала культура, створаная на падставе культуры рускай. Працэс русіфікацыі быў доўгім і цяжка запярэчыць, што ў Беларусі дамінуе руская мова, руская літаратура і такі ж погляд на гісторыю. Да таго ж яшчэ сродкі масавай інфармацыі, шоў-бізнес, мова вуліцы — усё гэта рускае. Русіфікацыя Беларусі адбылася.

**Ці беларуская нацыянальная культура таксама знаходзілася і знаходзіцца пад уплывам рускай культуры?**

Гісторыя Беларусі і Расіі з'яўляецца працэсам пранікнення культур. Падобна і з польскай культурай. Думаю, што кожны польскі піяніст скажа, што на яго творчасць меў уплыў Сяргей Рахманінаў. Пётр Чайкоўскі і Фёдар Дастаеўскі таксама паўплывалі на ўвесь свет. Чаму не павінны былі паўплываць і на беларускую культуру?

## Значыць, для Вас Фёдар Дастаеўскі – гэта родная літаратура?

Так, канешне. Я тыповы прадукт савецка-расійскай адукацыі. Пра існаванне беларускай літаратуры я даведаўся на філалагічным факультэце , дзякуючы такім людзям як Вінцук Вячорка. Ён і падобныя да яго, першыя ў маім жыцці, звярнуліся да беларускай культуры і змаглі распавесці пра яе іншым. Раней мы не мелі выбару, чыталі рускую літаратуру, тым больш што беларускамоўная літаратура савецкая эпохі не была багатай. Я нават Васіля Быкава больш чытаў па-руску, чым па-беларуску.

## Ці важна для Вас адраджэнне беларускай мовы?

Не ляжыць мне гэта на сэрцы. Што так павінна быць мне падказвае розум, а не сэрца. Я нарадзіўся ў свеце, які размаўляў па-руску. Я гавару па-руску і думаю па-руску, і хіба што ўжо не навучуся думаць па-беларуску. Я ведаю беларускую мову пэўна не горш за іншых, але ведаю, што яна не мая родная мова і ёй не стане. Мяркую аднак, што для новых пакаленняў яна павінна стаць роднай мовай.

Чаму аднак людзі, якія размаўляюць па-руску, павінны адчуваць сябе горшымі? Калі ў 80-х гадах з'явілася "Талака"[1] і стваралі яе мае знаёмыя, я таксама хадзіў на іх сходы і спрабаваў пісаць пра іх у савецкай прэсе. Я быў адным з нешматлікіх журналістаў, якія ездзілі амаль на ўсе акцыі "Талакі". Я прысутнічаў, калі ствараўся Беларускі Народны Фронт і супрацоўнічаў пры ўтварэнні газеты Беларускага Народнага Фронту. Ці гэта не лічыцца толькі таму, што я не размаўляю штодзень па-беларуску?

[1] "Талака" — незалежнае гісторыка-культурнае аб'яднанне моладзі, якое ўзнікла ў Менску ў 1985 г. з мэтай абароны культурнай спадчыны. Ініцыятарамі ўзнікнення "Талакі" былі: Сяргей Вітушка, Вінцук Вячорка, Віктар Івашкевіч, Алег Суша. Галоўнымі формамі дзейнасці згуртавання была абарона гістарычных і археалагічных помнікаў, змаганне за адкрыццё беларускамоўных класаў і школ, культурна-асветніцкая дзейнасць, вяртанне нацыянальных святаў. Разам з іншымі арганізацыямі "Талака" паспрыяла ўзнікненню Беларускага Народнага Фронту.

**Гэта значыць, што калі б Лукашэнка, які асабіста цешыўся, што Вы вымушаныя былі зачыніць газету "БДГ", дазволіў сёння Вам яе ізноў выдаваць, то і яна ізноў выходзіла б на рускай мове?**

Безумоўна. Па той простай прычыне: гэта была газета, якая пісала пра бізнес. На свеце мовай бізнес-кантактаў з'яўляецца англійская. Але ў культурным асяроддзі, у якім я жыву, мовай справы з'яўляецца руская. У беларускай мове нават не выпрацавана адпаведнай лексікі, паняццяў, патрэбных для апісання сучасных галін жыцця. Я кажу гэта як філолаг. Знішчана інтэлігенцыя, якая была носьбітам беларускай мовы. А ў гэты час свет пайшоў наперад, з'явіліся новыя паняцці, але іх няма ў беларускім слоўніку.

**Алег Трусаў сцвярджае, што без беларускай мовы Беларусь гэта толькі Северо-Западный край.**

Трусаву трэба паказаць глобус, а на ім краіны, якія стварылі ўласныя дзяржавы і цудоўную культуру, хоць іх моўная сітуацыя была яшчэ больш складанай. Але не буду з ім спрачацца. Калі ён лічыць, што без мовы няма дзяржавы і культуры, то няхай так лічыць і ўсё.

Насамрэч пытанне мовы ў Беларусі сёння не ёсць найважнейшым. Найбольшай праблемай з'яўляецца тое, што дзяржава робіць з асобай.

Тут ёсць маленькая група людзей, якія размаўляюць па-беларуску, але ёсць таксама вялікая група, што размаўляе па-руску і прымае еўрапейскую сістэму каштоўнасцей. Звыш двух мільёнаў людзей гавораць па-руску, слухаюць расійскую папулярную музыку і не маюць паняцця пра беларускую мову і беларускую гісторыю, але адчуваюць сябе беларусамі. Кімсьці іншымі, чым рускія. На месцы беларускіх апазіцыянераў я б радаваўся, што такія людзі яшчэ ёсць. І бярог бы іх, а не пагарджаў. Гэта вялікае дасягненне: цэлыя стагоддзі гісторыі Беларусі — гэта войны, прыналежнасць да розных дзяржаў, іншая назва — то Літва, то Северо-Западный край — а людзі, якія адчуваюць сябе беларусамі, вытрымалі. Ёсць адчуванне народу, гэты народ жыве, з гэтага трэба толькі цешыцца. Відавочна, Беларусь захоўвала сябе праз усе гэтыя стагоддзі менавіта такім чынам, прымаючы тое, што і так ёй навязвалі сілай.

**Аднак Вы лічыце працэс беларусізацыі пазітыўным, бо кажаце, што новыя пакаленні павінны размаўляць па-беларуску?**

Так, але працэс гэты будзе выглядаць іначай, чым сабе гэта прыдумалі беларускія апазіцыянеры. Толькі на працягу апошніх шаснаццаці гадоў людзі мелі нейкі шанец, каб даведацца, што існуе іншая гісторыя гэтай краіны чым тая, напісаная Мікалаем Карамзіным[2] ці Васілём Ключэўскім[3]. Беларусы ўбачылі, што яны таксама самастойны народ і можна спадзявацца ўжо разумеюць, што ўласная дзяржава — гэта каштоўнасць. У гэтым працэсе важную ролю адыграў палітык, пра якога мы прывыклі казаць дрэннае: Аляксандр Лукашэнка. Няважна, што гэты працэс адбываўся толькі дзякуючы таму, што Лукашэнка бараніў сваю ўладу, але важна, што ён увогуле быў.

Не ўдалося аднак тое, пра што марылі многія палітыкі, культуролагі, якія стараліся перанесці старажытную беларускую мову і старое мысленне пра Беларусь на сённяшнюю краіну: раз-два і Вялікае Княства Літоўскае. Так, на жаль, не атрымаецца. Грамадскасць не прыняла спробаў, распачатых дзеячамі Беларускага Народнага Фронту. І што б нам не казалі дзеячы БНФ, тут ніколі не будзе адназначнага і лёгкага вяртання да беларускай культуры. І не будзе такой Беларусі, пра якую яны думаюць, хоць бы невядома хто прыйшоў да ўлады, нават Зянон Пазняк.

Працэс фармавання новай самасвядомасці толькі пачынаецца і насамрэч будзе выглядаць іначай, чым бы хацелі кіраўнікі апазіцыі. Узнікне новая самасвядомасць і новая культура. Нельга адкідаць усё тое, што рускае і прымаць адзіна тое, што належыць старой беларускай культуры. Не ўсё, што фармавала нашу культуру звонку дрэннае, варожае і гэтаму трэба прыпісваць знак мінус: польскае дрэннае, рускае дрэннае, літоўскае дрэннае. Быць можа, гэта новая беларускасць з гледзішча знаўцаў культуры і гісторыкаў, мала беларуская, але яна бліжэй да рэаліяў. Калі толькі будзе існаваць дзяржава Беларусь, то гэты працэс пойдзе. Беларускія інтэлектуалы павінны з гэтым пагадзіцца, а пасля

---

2 Мікалай Карамзін (1766-1826) — расійскі пісьменнік і гісторык; аўтар апавяданняў і шматтомнай гісторыі Расіі, прыхільнік тэзіса, што развіццё Расіі не адхіляецца ад агульнаеўрапейскіх тэндэнцый.

3 Васіль Ключэўскі (1841-1911) — расійскі гісторык, прафесар Маскоўскага ўніверсітэту (1882-1911), член Пецярбургскай Акадэміі Навук; галоўны твор — “Курс русской истории” (т. 1-4, 1904-11, т.5, 1921).

іх будзе ўжо новая хваля інтэлігенцыі. А людзі, звязаныя з беларускай нацыянальнай ідэяй і так, з часам, робяцца менш радыкальнымі. Міне яшчэ крыху часу і пачнуць інакш глядзець на сітуацыю ў нашай краіне. Па-іншаму будуць гаварыць пра гэту праблему. Убачаць, што грамадства прымае рускую культуру, бо яна патрэбная, але чэрпае як з рускай, так і з заходняй культуры.

**Калі сядзіш у беларускай кавярні альбо едзеш беларускім цягніком, то заўсёды гучыць толькі расійская музыка.**

Беларускія радыёстанцыі маюць абавязак трансляваць большасць нацыянальных спевакоў, а не замежных. Можна спытаць, на якой мове яны спяваюць? Безумоўна, па-руску. Але ці пакутуе ад гэтага беларуская нацыянальная культура? Ці творы з-за гэтага горшыя? Я так не лічу. А калі гэта нізкі ўзровень, то можа і лепей, што беларуская мова не мае з ім нічога агульнага?

**Ці беларусы не пакутуюць ад комплекса непаўнавартасці параўноўваючы сябе з рускімі?**

Ключ да разумення ўсіх гэтых праблем ляжыць у гісторыі. Як беларус можа адчуваць сябе паўнавартасным грамадзянінам, калі ён не ведае гісторыі сваёй краіны? А так было ў СССР. Як можна адчуваць сябе паўнавартасным грамадзянін краіны, якая ўжо трынаццаць год знаходзіцца пад аўтарытарнай уладай? Няма падручніка, дзе можна было б знайсці тлумачэнне, чаму беларусы — гэта беларусы.

У грамадстве існуе падсвядомае адчуванне страты самаідэнтыфікацыі. Не ведаючы сваёй гісторыі, не маючы ведаў пра сваю дзяржаву і народ, нельга з усведамленнем сказаць: “Я беларус”. Уся сучасная беларуская культура звязана з пакутамі, перажываннем гэтага комплексу. Але я б не сказаў, што гэта комплекс недахопу каштоўнасцяў. Гэта схаваны боль, які вынікае са страты самасвядомасці. Інакш нельга патлумачыць, чаму нават у савецкія часы беларусы адчувалі сябе асаблівым народам, хоць другой такой, настолькі зрусіфікаванай рэспублікі не было ва ўсёй краіне.

## А Вы баіцёся Расіі?

Не, бо чаго тут баяцца? Не маю паняцця, адкуль гэты страх і антырасійскія стэрэатыпы. Чым расійская мафія горшая за італьянскую?

## А падыход дзяржавы да чалавека?

Не буду гэтага апраўдваць, гэта мяне раздражняе і нярвуе. Канешне, можна тлумачыць, што гэта гістарычная неабходнасць і мангольская спадчына, але мяне гэта не пераконвае.

## Як Вы, як беларус, успрымаеце Маскву? Ці гэта, на Вашу думку, адзін з культурных цэнтраў, такіх як Нью-Ёрк, Лондан ці Тэгеран? Цэнтр тэрыторыі, межы якой выходзяць па-за межы ўласна Расіі?

Калі паглядзець на Маскву вачыма выдаўца ці прадпрымальніка, сцверджу без сумнення, што гэта вялізны бізнес-цэнтр. Масква не нагадвае ні Парыж, ні Лондан, але — як уся Расія — дынамічна развіваецца. Кожны, хто прыедзе ў Маскву, адразу адчуе, што гэта асобны свет. Калі прыязджаеш у Маскву, ідзеш хаця б на гэтую вядомую ўсім Чырвоную Плошчу і стаіш перад царквой Васіля Блажэннага, адразу пачынаеш разумець, што маеш справу з культурай і гісторыяй і не можна запярэчыць, што гэта вялікая культура і вялікая гісторыя. Навошта адкідваць гэты факт? Але трэба таксама звярнуць увагу і на тое, што гэта сінтэтычная культура, у якой перамешаны азіяцкія і еўрапейскія элементы.

## Ці азначае гэта, што Беларусь усё яшчэ застаецца правінцыяй імперыі, цэнтр якой Масква?

З культурнага і эканамічнага гледзішча Менск канешне з'яўляецца правінцыяй былой імперыі і доўга яшчэ будзе толькі чарговым горадам пасля вялікіх расійскіх метраполій. Можа ўдалося б яго параўнаць

з Самарай, але ў адносінах да Масквы ён другасны. Вялікую ролю ў беларуска-расійскіх адносінах адыгрывала і адыгрывае эканоміка. Ні ў балтыйскіх краінах, ні ва Украіне не была створана такая эканоміка, якая была запланавана спецыяльна для Беларусі. Тры мільёны чалавек сталіся залежнымі ад эканамічных саюзаў з Расіяй.

### Як гэта дзейнічае?

Твая праца і твой заробак залежаць ад зусім іншай, не роднай эканомікі. Залежаць ад паставак энергіі і сыравіны з другой дзяржавы. Ёсць сыравіна — ёсць праца, сыравіна перастане прыходзіць у Беларусь — можаш стаць беспрацоўным. Гэта простая прычына пастаяннай залежнасці Беларусі ад Расіі, пачаўшы ад эканомікі і канчаючы культурай.

Але такім спосабам многім прадпрыемствам удалося забяспечыць заказы, выратаваць шмат месцаў працы і пазбегнуць вялікіх грамадскіх пратэстаў, а гэта дапамагло беларускай дзяржаве. Звольненыя з працы работнікі сапраўды не задумваліся б, як выглядае праблема гісторыі Беларусі і які статус беларускай мовы. Ім патрэбна праца на фабрыцы. Яны плююць на нацыянальную культуру і гэта яшчэ адна розніца паміж беларусамі і жыхарамі балтыйскіх краін.

### Ці беларуская эканамічная эліта паварочваецца на Захад, ці ўвесь час арыентавана на Маскву?

Фінансавая эліта мае, як і рабочыя, вельмі просты вектар: глядзяць у той бок, адкуль грошы. Да гэтага часу, калі мы мелі нейкія фінансавыя папаўненні, то гэта былі грошы з Масквы.

### Грошы, якія ідуць з Масквы, небяспечныя, бо робяць краіну залежнай ад вялікага суседа.



Расіі не хапае сур'ёзных інвестыцыйных планаў. Масква дае грошы ў сыравіне, выкарыстоўвае іх як інструмент палітычнага і эканамічнага ціску. З гэтага пункту гледжання заходнія грошы лепшыя. Гэта чысты капітал  і, напэўна, у большай ступені ўплывае на развіццё

рынка. Нельга сказаць, што гэтыя грошы зусім свабодныя ад палітыкі, але напэўна значна менш ад яе залежаць, чым расійскія.

З другога боку ў Беларусі ўсе грошы добрыя. Лукашэнка, зрэшты, баіцца наплыву і расійскага, і заходняга капіталу, бо ўсе сур'ёзныя датацыі і фінансавыя інвестыцыі развальваюць яго сістэму, бо робяць іх атрымальнікаў менш залежнымі ад рэжыму. Таму рэжым спрабуе прыцягнуць у Беларусь капітал з Лацінскай Амерыкі і арабскіх краін. Яны павінны гарантаваць сістэме пражыванне. Усе інвестыцыі, якія будуць функцыянаваць згодна з правіламі рынка, у стане знішчыць рэжым.

**Абмяркоўваем тое, як Расія ўплывае на Беларусь. Але магчымы таксама і адваротны кірунак. Расіянам падабалася дзяржава, якую будаваў Лукашэнка. На што разлічвалі тыя расійскія палітыкі, якія запрашалі яго ў Расію на аб'езд губерніяў?**

Яны мелі надзею, што беларуская эканоміка стане яшчэ больш завязанай на расійскай. Лукашэнка насіўся з думкай стаць прэзідэнтам Расіі, але адкінуў гэтую ідэю. Ён зразумеў, што пасля прыходу да ўлады Пуціна, гэта стала немажлівым. Не ўсюды яго запрашалі, ён сам таксама туды пхаўся. Як менеджэр "карпарацыі Беларусь" займаўся збытам сваёй прадукцыі, якой ніхто не хацеў купляць. Усю гэту "безнадзёгу" пакідаў у Расіі. Гэта не смешна, але ў нас шмат прадпрыемстваў, прадукцыя якіх нікому не патрэбныя. А ён гэта ўсё прадаваў.

**Прадаваў таксама веру ў Савецкі Саюз?**

Гэта харызматык, які ў стане ўсё патлумачыць: што ЗША дрэнныя, а славянскія народы добрыя, што вялікая расійская імперыя з'яўляецца спадкаемцай СССР. Хто б іншы змог так пераканаўча казаць пра гэта? Можа таму расіяне некаторы час глядзелі на яго як на палітычнага лідэра, які дае ім ідэі садружнасці славянскіх дзяржаў, расійскай моцы, расійска-беларускага сяброўства. Бо сярод расіянаў таксама нарадзіўся комплекс пасля распаду СССР. Такая вялікая краіна, а развалілася. Самалюбства расіян пакутавала ад гэтага. Лукашэнка дасканала адчувае, што людзі хочуць у дадзены момант ад яго пачуць і гаворыць гэта. Руская мова і культура, якія падтрымліваліся ў

Беларусі, зрабілі так, што распад вялікай дзяржавы стаўся для расіянаў менш балючым. Расійская адысея Аляксандра Лукашэнкі была добрай палітычнай і эканамічнай гульнёй, патрэбнай як Беларусі, так і Расіі. Ён атрымліваў восем мільярдаў долараў штогод за гэтыя свае мары. Хто быў супраць гэтага? Я сам пайшоў бы на такую дамову.

**Сёння Расія глядзіць на Беларусь хіба ўжо з меншай сентыментальнасцю. Аляксей Міллер[4] пасля падпісання пагаднення аб набыцці Белтрансгаза сцвердзіў, што гэта паварот да натуральнага стану – менавіта так і павінна быць – Масква пераймае свае трубапроводы.**

Гэта расійскі пункт гледжання. Расія назвала сябе спадкаемцай СССР і размова тут не ідзе выключна пра паняцце прыватнай уласнасці. Размова перад усім пра прыняцце расійскай ідэі паўстання імперыі. Не трэба злавацца на Расію. Гэта вялізная краіна, якая можа захаваць свой статус толькі адзіным спосабам — праз пастаянныя спробы стварыць імперыю, цэнтр, з якім кожны будзе лічыцца. Інакш Расіі не будзе.

Масква не здольная перастаць думаць пра Беларусь як пра сваю тэрыторыю. Памятае, што ў 1990-91 гадах уклала два мільярды долараў у мадэрнізацыю беларускіх прадпрыемстваў. Такое рашэнне прыняў яшчэ ўрад СССР. Расія хоча мець прыбытак з гэтых інвестыцый як спадкаемца СССР.

Аднак тры гады таму гэтак жа думалі пра Украіну. А цяпер, пасля аранжавай рэвалюцыі, расіяне пачынаюць разумець, што гэта не іх тэрыторыя. Падобна будзе і з Беларуссю. Яны вымушаны развітвацца са "сваімі" тэрыторыямі, хоць даецца ім гэта вельмі цяжка.

**Лукашэнка неяк не нагадвае лідэра каляровай рэвалюцыі...**

Лукашэнка зрабіў выбар. Ён адмовіўся ўвайсці ў склад саюзнай дзяржавы.



[4] Аляксей Міллер (нар. у 1962) — з 2001 г. старшыня Праўлення ААТ "Газпрам".

**Але таксама не выбраў курс на Захад. Як доўга можна функцыянаваць у падвешаным стане - паміж Еўропай і Расіяй?**

У палітычным сэнсе — так доўга, як толькі захоча. У эканамічным — да таго часу, пакуль Беларусь з’яўляецца транзітнай краінай. А калі паставіць пытанне, кім будуць беларусы ў культурным сэнсе, то магу адказаць: еўрапейцамі. Я ў гэтым упэўнены.

Усе чакаюць хуткіх змен на працягу пяці гадоў. Але нават калі Беларусь будзе “пасоўвацца” на Захад, то змены не будуць насіць характару рэвалюцыі. Дастаткова падумаць пра ментальнасць беларусаў і тлумачэнне, чаму будзе, менавіта, так, а не іначай, стане відавочным. Беларусь будзе павольна і асцярожна ісці да зменаў уласнай дарогай і калі на гэтай дарозе нішто сур’ёзна не напалохае беларусаў, то нам удасца дайсці да мэты.

KAMUNIKAT.org